Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 33 (464) | Серада, 15 лістапада 1961 г. | Цана 1 кап.

УНІВЕРСІТЭТ НА КАСТРЫЧНІЦКАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ



*XVI камсамольская канферэнцыя БДУ*

## ШМАТ ЗРОБЛЕНА. ТРЭБА ЗРАБІЦЬ ЯШЧЭ БОЛЬШ!

НАПЯРЭДАДНІ СЛАЎНАЙ ПАДЗЕІ У ЖЫЦЦІ УНІВЕРСІТЭТА—40-й ГАДАВІНЫ БДУ — ПРАХОДЗІЛА ЧАРГОВАЯ, XVI КАМСАМОЛЬСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ. ЯЕ ДЭЛЕГАТЫ САБРАЛІСЯ Ў АКТАВАЙ ЗАЛЕ ГУМАНІТАРНЫХ ФАКУЛЬТЭТАЎ, КАБ АБМЕРКАВАЦЬ НАДЗЕННЫЯ ЗАДАЧЫ, ШТО СТАЯЦЬ ПЕРАД НАШАЙ КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ. З ДАКЛАДАМ АБ РАБОЦЕ КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ВЫСТУПІЎ *РАМАН МАЛЮКОВІЧ*.

## Вучыцца—галоўная задача

*Камсамольская арганізацыя, падкрэсліў дакладчык, лічыла і лічыць сваёй галоўнай задачай аказанне дапамогі партыйнай арганізацыі і рэктарату ў падрыхтоўцы кваліфікаваных і адданых справе партыі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Таму пытанні вучобы і дысцыпліны студэнтаў былі ў цэнтры ўвагі камсамольскай арганізацыі.*

*Вынікі летняй экзаменацыйнай сесіі паказваюць, што ў гэтай справе дасягнуты пэўныя поспехі. З 2463 студэнтаў першых—чацвёртых курсаў 208 здалі экзамены на «выдатна», 748—на «добра» і «выдатна», 1280—на «добра» і «здавальняюча» і 225 чалавек атрымалі нездавальняючыя адзнакі.*

*Найбольшая колькасць нездавальняючых адзнак прыпадае на першыя—другія курсы. Напрыклад, на геаграфічным факультэце з 16 нездавальняючых адзнак 10 пастаўлены на першым курсе, 2—на другім. Аналагічнае становішча на фізічным, матэматычным і некаторых іншых факультэтах.*

*Тлумачыцца гэта тым, што студэнты першых курсаў не ўмеюць арганізаваць свой працоўны дзень. У сувязі з гэтым камітэт камсамола ўдзяліў асаблівую ўвагу рабоце з першакурснікамі. Амаль на ўсіх факультэтах былі праведзены вечары сустрэчы першакурснікаў са студэнтамі старэйшых курсаў, на якіх выкладчыкі і лепшыя студэнты расказалі аб правільнай арганізацыі рабочага дня, аб тым, як лепш весці канспекты і г. д.*

*Адной з важнейшых прычын дрэннай паспяховасці, адзначае дакладчык, з'яўляюцца пропускі лекцый. За мінулы навучальны год яны склалі па універсітэту астранамічную лічбу—30320 гадзін. Сярод факультэтаў «рэкорд» належыць філфаку. 590 студэнтаў гэтага факультэта прапусцілі звыш 9 тысяч гадзін, апярэдзіўшы бліжэйшых «канкурэнтаў»—студэнтаў фізічнага, матэматычнага і юрыдычнага факультэтаў.*

*Нас радуе, што большасць выпускнікоў абаранілі дыпломы і здалі дзяржаўныя экзамены на «добра» і «выдатна». Мы можам ганарыцца такімі выпускнікамі, як Снапко, Арлоў (фізфак), Платонаў (матфак), Сокалаў (хімфак), Шушкіна (біяфак), Цяцера, Кручок (геафак) і цэлы рад іншых юнакоў і дзяўчат, якія выдатную вучобу спалучалі з актыўнай грамадскай работай.*

*Ганаровай задачай камсамольскай арганізацыі універсітэта з'яўляецца аказанне дапамогі студэнтам вячэрняга і завочнага факультэтаў. Зрабіць тут можна і трэба больш, чым ужо зроблена.*

*Неабходна адзначыць, падкрэслівае Р. Малюковіч, што пытанні вучобы не заўсёды былі ў цэнтры ўвагі кожнай камсамольскай групы, кожнага курса, а таму нашы вынікі значна ніжэй магчымых. Мы можам і павінны дабіцца толькі добрай і выдатнай вучобы нашых камсамольцаў.*

(Заканчэнне на 2-й стар.)

### СКЛАД БЮРО КАМІТЭТА КАМСАМОЛА, ВЫБРАНАГА XVI КАМСАМОЛЬСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫЯЙ

**Малюковіч Раман**—сакратар,
**Сушкевіч Леанід**—другі сакратар,
**Валевіч Аляксандр**—сакратар па арграбоце,
**Атрошчанка Уладзімір**—сакратар па палітмасавай рабоце,
**Дароніна Ніла**—шэфскі сектар,
**Радоўскі Эдуард**—навуковы сектар,
**Красней Віктар**—акадэмічны сектар,
**Фядотаў Аляксандр**—спартыўны і абаронны сектар,
**Кляшчонак Леанід**—бытавы сектар,
**Заводскі Іван**—культмасавы сектар,
**Коўтун Леанід**—працоўны сектар,
**Усенка Эдуард**—падрыхтоўка пасяджэнняў камітэта,
**Кісялёва Зінаіда**—старшыня камісіі «У нагу з культурай».

УНІВЕРСІТЭТ НА КАСТРЫЧНІЦКАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ



## Урачыста і радасна

Дзень 7-га лістапада, якога з такім нецярпеннем чакалі студэнты, выдаўся пахмурым. Але гэта не было перашкодай для радаснага святочнага настрою сотням юнакоў і дзяўчат, якія сабраліся каля корпуса гуманітарных факультэтаў. У руках у юнакоў—транспаранты, лозунгі з палымянымі заклікамі, яркія пано, чырванню палымнеюць сцягі, у многіх—партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада, членаў Прэзідыума ЦК КПСС. Навокал чуюцца вясёлыя жарты, смех, даносіцца музыка. Настрой святочны! Моладзь яшчэ не пастроілася ў калоны: пад вясёлую музыку аркестра кружацца юнакі і дзяўчаты ў імклівым вальсе.

Наступіла хвіліна, калі калоны універсітэта выходзяць на шырокі Ленінскі праспект, уліваюцца ў шматтысячны паток дэманстрантаў.

У галаве універсітэцкай калоны па-мастацку выкананы барэльеф стваральніка першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы—Уладзіміра Ільіча Леніна. Золатам ззяюць літары: «БДУ імя У. І. Леніна». Універсітэт святкуе двайное свята—44-ую гадавіну Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і 40 год з дня свайго нараджэння. Сорак год назад, 30 кастрычніка 1921 года вялікі Ленін падпісаў дэкрэт аб адкрыцці Беларускага дзяржаўнага універсітэта—першай нацыянальнай вышэйшай установы.

Сёння ж па праспекту ідуць дзесяткі выхаванцаў універсітэта. Сярод іх нямала выдатнікаў вучобы, камсамольскіх актывістаў. Упэўнена крочыць студэнцкая моладзь. Кожны са студэнтаў універсітэта па-баявому ўспрыняў палымяныя радкі з Праграмы КПСС аб тым, што ім будаваць камунізм, жыць пры камунізме.

У вялікую дарогу рыхтуюцца студэнты. Любая задача будзе пад сілу толькі таму, хто добра ведае сваю справу, не спыняецца на дасягнутым, хто ўвесь час—у шляху.

Іменна такіх людзей і выхоўвае наш універсітэт. Сярод дэманстрантаў—будучыя здольныя педагогі, юрысты, біёлагі, хімікі, матэматыкі, фізікі. Яны ідуць у факультэцкіх калонах. Кожны факультэт упрыгожаны па-свойму. Вось вялікі макет касмічнага карабля «Усход-2», дзесяткі ярказялёных з беларускім арнаментам сцягаў, жывыя кветкі ў руках у юнакоў. Нягледзячы на восень, здаецца, крочыць сама Вясна. Гэта моладзь з яе жыццерадаснасцю, бадзёрасцю. Гучыць дружнае «ура!» у гонар партыі, роднага ЦК. Сярод калон універсітэта асабліва выдзяляюцца танцоры ў прыгожых нацыянальных касцюмах і сукенках. Яны выконваюць розныя танцы. На другі дзень танцавальны калектыў БДУ можна было ўбачыць на экранах у кадрах кінахронікі.

Дэманстрацыю універсітэцкіх калон завяршылі нашы спартсмены. Яны ў белых світэрах, дужыя, стройныя, чоткім крокам прайшлі перад урадавымі трыбунамі. Ідуць дтсаафаўцы, гімнасты, легкаатлеты.

Крочыць моладзь пад разгорнутымі чырвонымі сцягамі, крочыць у жыццё, акружаная бацькоўскімі клопатамі роднай партыі і ўрада!

Закончаны парад і дэманстрацыя. Але універсітэцкая моладзь доўга яшчэ весялілася ў гэты дзень...

## СВЯТОЧНЫЯ ВІНШАВАННІ

У сувязі са святкаваннем Вялікага Кастрычніка ў адрас універсітэта паступілі шматлікія віншаванні ад розных устаноў, ВНУ, асоб.

Сярод віншавальных тэлеграм урадавая тэлеграма ад Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В. І. Казлова, ад міністра вышэйшай, сярэдняй і спецыяльнай адукацыі тав. Дарашэвіча, ад аднаго з баявых караблёў Чорнаморскага флота, ад вайсковай часці.

Прышлі віншаванні таксама ад універсітэтаў: Таджыкскага, Вільнюскага, Азербайджанскага, Казанскага, Маскоўскага, Ленінградскага, Кіеўскага, Далёкаўсходняга і іншых. Цёплым словам віталі універсітэт многія інстытуты і акадэміі.

### НА ГЭТЫ РАЗ ПЕРАМОГА

У канцы кастрычніка адбылася таварысцкая сустрэча па шашках паміж камандамі Беларускага і Ленінградскага універсітэтаў.

Каманды сустракаюцца не ўпершыню. У ліпені гэтага года на камандным першынстве краіны сярод ВНУ шашысты абодвух універсітэтаў добра пазнаёміліся. Тады поспех спадарожнічаў ленінградцам.

І вось таварысцкая сустрэча, прысвечаная XXII з'езду партыі і 44-ай гадавіне Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Упартая барацьба разгарнулася за ўсімі дошкамі. На гэты раз нашы шашысты былі яўна мацнейшымі. Выйграўшы тры партыі (Дашкевіч, Драбушэвіч і Кухарчук), і чатыры звёўшы ўнічыю (Гелер, Абрамовіч, Розін і Лесіна), каманда БДУ перамагла з лікам 5:2.

**Э. ЯСНЫ.**

УНІВЕРСІТЭТ НА КАСТРЫЧНІЦКАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ



## XVI камсамольская канферэнцыя БДУ

# ШМАТ ЗРОБЛЕНА. ТРЭБА ЗРАБІЦЬ ЯШЧЭ БОЛЬШ!

## Першая сцежка ў навуку

У МІНУЛЫМ годзе ва універсітэце працавала 40 студэнцкіх навуковых гурткоў, у якіх займалася 435 чалавек. У васьмі навуковых гуртках біяфака плённа працавалі больш 150 студэнтаў. Палепшылі сваю работу навуковыя гурткі філфака і геафака.

Цікавая работа праводзіцца гуртком гісторыі КПСС па вывучэнню патрыятычнага руху брыгад і ўдарнікаў камуністычнай працы на камвольным камбінаце, трактарным і аўтамабільным заводах.

Праводзячы навукова-даследчую работу ў гуртках, студэнты аказваюць значную дапамогу народнай гаспадарцы. Студэнты біяфака штогод па заданню Міністэрства сельскай гаспадаркі праводзяць картаванне глеб на плошчы 50—60 тысяч гектараў. Кошт гэтых работ 15—20 тысяч рублёў новымі грашыма. Члены гуртка фізічнай геаграфіі ў гэтым годзе правялі здымку азёр Вымна, Мядзесна і іншых. Гэта мае вялікае значэнне для развядзення ў названых вадаёмах каштоўных парод рыбы.

Практычнае значэнне маюць многія навуковыя работы студэнтаў фізфака і матфака. Студэнтка фізічнага факультэта Ярошына аказала вялікую дапамогу ў наладжванні тэхналогіі на адным з заводаў.

Важнай падзеяй у жыцці навукова-даследчых гурткоў з'яўляецца правядзенне навуковых канферэнцый. За справаздачны перыяд было праведзена 5 канферэнцый, на якіх студэнты заслухалі і абмеркавалі 371 даклад.

Шмат увагі навуковай рабоце студэнтаў удзяляюць прафесары Эльберт, Некрашэвіч, Старобінец, Рагозін, Мядзведзеў; дацэнты Фрыдман, Прытыцкая, Шкляр, Фактаровіч і іншыя.

Істотным недахопам у навукова-даследчай рабоце з'яўляецца тое, што не па ўсіх дысцыплінах створаны навуковыя гурткі, не ўсе работы вызначаюцца добрай якасцю.

Камсамольскім арганізацыям неабходна шырэй прыцягваць студэнтаў да навуковай работы, дабіцца творчага падыходу да вывучаемых пытанняў, прывіць студэнтам навыкі самастойнай работы.

## Вывучаць грамадскія дысцыпліны

*ПЫТАННІ ідэйнага выхавання — адзін з важнейшых участкаў нашай работы. Выключна вялікую ролю ў справе выхавання моладзі мае вывучэнне гісторыі КПСС, палітэканоміі і іншых грамадскіх навук. Сапраўдным марксістам, гаварыў Ленін, можна стаць тады, калі ўзбагаціш сваю памяць ведамі ўсіх тых багаццяў, якія выпрацавала чалавецтва.*

*У пераважнай большасці студэнты сур'ёзна вывучаюць грамадскія навукі. Аб гэтым сведчаць наступныя даныя: у мінулую летнюю экзаменацыйную сесію гісторыю КПСС здавалі 1340 чалавек; з іх 281 здалі на «выдатна», 557—на «добра». Філасофію здавалі 674 чалавекі, з іх 171 здалі на «выдатна», 301—на «добра». Нельга не сказаць і аб тым, што па гісторыі КПСС 52 чалавекі атрымалі «нездавальняюча», 475—«здавальняюча», па палітэканоміі 8 і па філасофіі 3 нездавальняючыя адзнакі. Наяўнасць такой колькасці дрэнных і пасрэдных адзнак гаворыць аб тым, што камсамольская арганізацыя праходзіла міма гэтага пытання. Нярэдка камсамольскія арганізацыі не заўважалі таго, што асобныя студэнты прапускалі лекцыі і семінары, не канспектавалі матэрыял, дрэнна рыхтаваліся да семінарскіх заняткаў. Вось і атрымліваецца, што сёння мы павінны крытыкаваць за непасляховасць студэнтаў Гусеву, Якубоўскую, Каленіка, Абраменка і іншых.*

## Наша вастрэйшая зброя

*ВЯЛІКУЮ РОЛЮ ў справе фарміравання поглядаў, перакананняў, выхавання ў людзей камуністычнай маралі адыгрывае перыядычны друк. Амаль усе студэнты універсітэта падпісваюцца на газеты. Найбольш арганізавана праходзіць падпіска на гістфаку, хімфаку і геафаку, не поўнасцю—на фізфаку, біяфаку і філфаку.*

*Нашы насценныя газеты і шматтыражка «Беларускі універсітэт» недастаткова асвятляюць жыццё студэнтаў, прапагандуюць лепшае. Гэта атрымліваецца таму, што камітэт камсамола і камсамольскія актывісты не падтрымліваюць цеснай сувязі з рэдакцыяй і не дапамагаюць ёй.*

## Абураемся іх паводзінамі

У РАБОЦЕ камсамольскай арганізацыі гадамі склаліся формы выхаваўчай работы, адной з якіх з'яўляюцца палітінфармацыі, якія праводзяцца па групах. Там, дзе актывісты хваравоць за справу, палітінфармацыі праходзяць жыва, цікава, актыўна.

Значная доля віны за недахопы ў выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў кладзецца на выкладчыкаў. Так, недастаткова добра адносяцца да выхавання студэнтаў выкладчыкі Кузняцова (фізфак), Мяцельская, Шчарбакова (філфак) і іншыя.

Цяпер аб іншым. 82 маладыя спецыялісты, скончыўшыя ў 1960 годзе універсітэт, не з'явіліся на работу па месцу назначэння. Падобныя дызертыры ёсць і ў ліку выпускнікоў гэтага года. Вядома, што ў 1961 годзе 47 выпускнікоў не з'явіліся на работу. Сярод іх Маслава, Нікалаева, Цэйтліна (біяфак), Фрыд, Бартман (матфак), Харавец, Анціпава, Капцілові, Галоўкін (філфак), Дзідзенка, Каралькова, Баброва (фізфак) і іншыя.

Гэтыя факты таксама сведчаць аб недастатковай выхаваўчай рабоце. Мы абураемся такімі паводзінамі нашых выпускнікоў і павінны разабрацца і строга спытаць з упамянутых камсамольцаў.

★ ★

Дакладчык спыніўся на іншых важных пытаннях. У прыватнасці, ён падкрэсліў, што добра працаваў інтэрнацыянальны клуб. Студэнты ў час летніх канікул нямала папрацавалі ў калгасах і на будаўніцтве галоўнага корпуса, студэнты-лектары прачыталі многа лекцый. Дакладчык гаварыў аб стане самадзейнасці, культурна-масавай, спартыўнай, шэфскай рабоце ва універсітэце, аб быце студэнтаў, аб маральным вобліку камсамольцаў, крытыкаваў адстаючых, барчукоў, студэнтаў, якія парушаюць вучэбную і бытавую дысцыпліну. У канцы Р. Малюковіч спыніўся на рабоце камітэта камсамола, назваў лепшых яго членаў і тых, хто нядобрасумленна адносіўся да сваіх абавязкаў.

## Гавораць дэлегаты канферэнцыі

Пасля справаздачнага даклада пачаліся спрэчкі. Аб вучобе і дысцыпліне, аб мастацкай самадзейнасці і грамадскіх даручэннях і многім іншым гаварылі ў сваіх выступленнях дэлегаты канферэнцыі.

Цікавым было выступленне **Салава** (матфак). Ён крытыкаваў недахопы, якія ёсць у рабоце камітэта камсамола і асобна спыніўся на арганізацыі вечароў адпачынку. Ён адзначыў, што за апошнія два гады ў нас не было ніводнага добрага вечара. Дэлегаты канферэнцыі дружнымі апладысментамі падтрымалі прамоўцу.

— Я за рамантыку! — гаворыць Салаў.—Я за тое, каб усе нашы студэнты жылі цікавым, паўнакроўным жыццём. Я за тое, каб камсамольскай арганізацыяй універсітэта ганарылася ўся рэспубліка. І гэта можна зрабіць!

Студэнт хімфака **Дзярбінскі** расказаў аб удзеле студэнтаў у будаўніцтве галоўнага корпуса універсітэта.

Студэнт **Скарабагатаў** расказаў, як праводзяцца сустрэчы студэнтаў юрфака з работнікамі суда і пракуратуры. Я лічу, адзначыў ён, што гэту ініцыятыву трэба падтрымаць на ўсіх факультэтах.

— Партыя даручыла камсамолу вялікую і пачэсную справу—выхоўваць юных ленінцаў, — сказала студэнтка філфака **Шаўчэнка**.—Камсамольцы БДУ актыўна ўключыліся ў гэту работу. Наша камсамольская арганізацыя можа ганарыцца лепшымі важатымі, такімі як Давыдоўская, Гурэцкая (філфак), Сысун (гістфак), Бондар, Быкоўская (біяфак) і іншыя.

У гэтым годзе мы павінны паслаць у школы горада 200 важатых. На ўсіх факультэтах, за выключэннем матэматычнага, важатыя ўжо вызначаны. Камсоргі павінны заняцца гэтай важнай справай і не толькі патрабаваць ад важатых справаздачы аб сваёй рабоце, але і дапамагаць ім.

Студэнтка геафака **Сапожнікава** расказала аб рабоце студсавета ў інтэрнаце № 4 (па вуліцы Дзімітрава).

Аб важных пытаннях у рабоце камсамольскай арганізацыі універсітэта гаварылі студэнты **Атрошчанка, Лашчынін, Калечыц, Цалко, Красней, Шэйнеман** і іншыя.

На канферэнцыі выступілі рэктар універсітэта **А. Н. Сеўчанка** і сакратар ЦК ЛКСМБ **Генадзь Жабіцкі.**

□

...КАНФЕРЭНЦЫЯ прыняла пастанову у якой намечаны шляхі ліквідацыі недахопаў у рабоце камсамольскай арганізацыі. У пастанове, у прыватнасці, гаворыцца: «Канферэнцыя выражае ўпэўненасць, што камсамольская арганізацыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі з чэсцю выканае пастаўленыя перад ёй новыя задачы і ўнясе свой уклад у справу пабудовы камунізма».

На канферэнцыі выбран новы склад камітэта камсамола.



Ва Уладзіміра Акаловіча цяпер гарачая пара. Ён працуе над дыпломнай работай «Вывучэнне фізіка-механічных уласцівасцей цэлюлозы і яе вытворных». Вось і на здымку вы бачыце, як Уладзімір праводзіць доследы над акісленай цэлюлозай.

Фото Л. КУЗЬМІЦКАГА.

## Вершы Любы ЛЯСНОЙ

### ДАРЭМНА ЧАКАЕ ЯЕ БАЯНІСТ

*Сумуе пявучы баян ля акна,*
*На вуліцы кліча дзяўчыну,*
*Ды толькі дарэмна, не выйдзе яна*
*Спаткацца з хлапцом пад каліну.*

*Падручнік! Галоўку прыгожа над ім*
*З вянком русых кос нахіліла,*
*Чытае уважліва. Можа зусім*
*Яна аб спатканні забыла?*

*А вечар цудоўны, і песні гучаць,*
*Навокал пах кветак, пах мяты,*
*Салоўкі дзесь свішчуць і жабы турчаць.*
*Дзяўчыне крыху сумнавата.*

*Дарэмна чакае яе баяніст,*
*А песні плывуць над садамі.*
*Не хутка дзяўчына апошні той ліст*
*Паўторыць, бо заўтра ж экзамен.*

### АДКАЖУ ЎСУР'ЁЗ

Запушыў сцяжынку
Беленькі сняжок,
На лясных галінках
Не шуміць лісток.

На мяне страсаеш
Ты з галінак снег,
Кажаш, што кахаеш?...
Я—нібы ў сне...

Прыгажосць такая!—
Воч не адарваць.
Ты ўсур'ёз пытаеш?
Што ж табе сказаць?

Ты хлапчына смелы,
Добры баяніст,
Працаўнік умелы,
Позірк твой агніст.

Пачакай з пытаннем.
Хутка інстытут
Скончу. На спатканні
Адкажу вось тут,

На сцяжынцы гэтай,
Дзе сцяна бяроз,
Дзе шмат песень спета,
Адкажу ўсур'ёз.

### ХТО ВІНАВАТ?

Сесія закончана чарговая.
Ты бывай, наш родны інстытут.
Зноў цябе дарога кліча новая:
Полацк, беларускі Нафтабуд.

А мяне—палі, лугі квяцістыя,
Вёска, гаманлівая рака,
Дзе вада, як лёд, крышталёва чыстая,
Лес і ціхі подых вецярка.

Сэрцу ўсё і роднае і мілае,
Ды, напэўна, буду я парой
Сумаваць, і песня хуткакрылая
Празвініць у думках над табой.

Ты ж заўжды з усмешкай хітраватаю
Прапаноўваў песню заспяваць.
Дык скажы, ці ж буду вінавата я,
Калі, часам, стану сумаваць?

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31. Тэлефон: 2-07-19.
АТ 06712. Друкарня выдавецтва МВСС і ПА БССР. Зак. 2318